# Абакралі каапэратыў

## В. Старыца Пукаўскай вол. Слуцкага пав.

Уночы з 20 на 21 верасьня ў каапэратыве здарылася пакража. Зладзеі ўлезьлі ў краму праз хлеў пад падрубы і праз вакно выцягнулі амаль ня ўсе тавары і збожжа. Усяго ўбытку на 2.000 пудоў жыта. Вядзецца высочваньне зладзеяў. Няскора цяпер стане наш каапэратыў на ногі. Падцялі, што называецца! І чаму было не наладзіць варту? Ці–ж гэта цяжка, калі кожнаму з хаты давялося–б павартаваць на год адну ці дзьве ночы?

— За дурной галавой да нагам бедным, — кажуць цяпер, а яно й праўда.

*1923*